**3.** Якіх якасцей характару не хапае гераіні (*стараннасці, уважлівасці, працавітасці, гасціннасці, дабрыні, настойлівасці*)?

**4.** З якім настроем трэба чытаць верш (*з вясёлым, сумным, незадаволеным*)? Чаму?

Што аб'ядноўвае творы «Калі ранец лёгкі і калі цяжкі?» Ніла Гілевіча і «Ці так чытала?» Мар'яна Дуксы?
Параўнайце герояў гэтых вершаў. Чым яны адрозніваюцца?

**Давайце абмяркуем.** Уявіце, што вы сустрэліся з гераіняй верша. Якія парады дасце дзяўчынцы, каб яна дабілася поспехаў у вучобе?

---

**Маўленчая размінка.** Прачытайце ўрывак з верша Міколы Чарняўскага. Правільна вымаўляйце гукі [ў], [дз'], [ц'].

Звініць званок, рассыпаў смех наўкола —
Ён сумаваў без нас у вольны час.
Дзень добры, верасень!
Дзень добры, школа!
Дзень добры, наш утульны, светлы клас.

***Сваво́ліць*** — весяліцца, забаўляцца, дурэць; рабіць так, як захочацца.



Правообладатель Национальный институт образования

# ВАСІЛЬ ХОМЧАНКА



## Крыўда

Вярнуўся Косцік са школы злосным.

— Ты чаму такі? — спытала маці.

— Мне двойку паставілі. За ката.

— За якога ката?

— Вось, — раскрыў Косцік сшытак. — Хіба я дрэнна яго намаляваў?

Кот быў прыгожы. Хвост — трубой, ву́сы белыя, шэрсць, як у тыгра, паласатая.

— Добры кот, — сказала маці.

— А настаўніцы не спадабаўся. Двойку паставіла.

— Ты, магчыма, сваволіў на ўроку выяўленчага мастацтва?





Правообладатель Национальный институт образования

— Не, — адказаў Косцік. — У нас сёння не было выяўленчага мастацтва. Я намаляваў яго на ўроку матэматыкі.

*Паводле Васіля Хомчанкі.*

---

Паразважайце, пра што маглі гаварыць маці з сынам.
Трэба яму патлумачыць, што на ўроку нельга займацца пабочнымі справамі.

---



1. Чаму Косцік вярнуўся са школы ў дрэнным настроі?
2. Паразважайце, за што настаўніца паставіла Косціку двойку.
3. Якія паводзіны і дзеянні вучняў спрыяюць паспяховаму навучанню?
4. Як вы разумееце сэнс назвы апавядання?



Размяркуйце ролі і выразна прачытайце твор па ролях.

**Творчае заданне**

1. Разгледзьце малюнкі (с. 21).
2. Адкажыце на пытанні.

1) Чым займаліся на палянцы звяры?

2) Каго Зайчык убачыў на дарозе? Куды ішлі звяры?

3) Чаму Зайчык заплакаў? Хто яго супакоіў?



Правообладатель Национальный институт образования

4) Куды прыйшоў Зайчык? З якой мэтай?
5) Як яго сустрэлі Бусел-настаўнік і вучні?



3. Складзіце невялікую казку па малюнках. Выкарыстайце апорныя словы, спалучэнні слоў і сказы.

*Апорныя словы, спалучэнні слоў і сказы:* на палянцы; гулялі ў футбол; на варотах; сумны Зайчык; па дарозе; з ранцамі; заплакаў; таксама хоча вучыцца; Сарока; пачала супакойваць; папрасіць у бацькоў; новенькі ранец; адправіўся ў лясную школу; прывітаўся; Бусел-настаўнік запрасіў сесці; Зайчык узрадаваўся; стаў вучнем.

4. Вызначце галоўную думку складзенай казкі.


Правообладатель Национальный институт образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. Хто з герояў сказáў гэтыя словы?

   а) Зімой нас шукайце на карце,
   Вясной — на радзімай зямлі;

   б) — Паглядзі,
   Што я прынёс:
   «Дзесяць» у кожным сшытку!..;

   в) Так вучыла, так гартала —
   толькі тройку атрымала!
   Можа, я не так чытала?..

2. Адкажыце на пытанні.

   а) Чаму Лёўку з верша Ніла Гілевіча «Калі ранец лёгкі і калі цяжкі?» ранец здаваўся то лёгкім, то цяжкім?

   б) Чаго не хапала ў характары гераіні з верша «Ці так чытала?» Мар'яна Дуксы?

   в) Якое цвёрдае слова даў сам сабе Косцік з апавядання Лідзіі Арабей «Новы сшытак»? Чаму?

***Разумею, магу растлумачыць...***

1. Які твор з гэтага раздзела асабліва спадабаўся? Чаму?

2. Якія ўменні і якасці, на вашу думку, трэба развіваць у сябе, каб пазнаваць невядомае?



Правообладатель Национальный институт образования